## ДАВЕДКІ 11 клас

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **4** | **4** | **2** | **4** | **4** | **5** | **4** | **3** | **3** | **6** | **39** |

**Заданне 1. 0,5+0,5**

| | | |
|---|---|---|
| 1. | [н'а плачуц'] | Гаворыцца, калі позна і бескарысна шкадаваць што-небудзь. |
| 2. | [н'а вык'ін'эш] | Кажуць у апраўданне, калі даводзіцца гаварыць і што-небудзь непрыемнае. |
| 3. | [н'э напјэс'а] | Гавораць, калі жадаюць падкрэсліць, што хараство, прыгажосць не асноўныя пры выбары жонкі ці мужа. |
| 4. | [б'ас хл'эба] | Калі есці страву без хлеба, то добра не наясіся. |

***Максімальная колькасць балаў – 4.***

**Заданне 2.**

Неба – пяты акіян; жаўранак – вясновы госць, срэбны званочак; лес – зялёнае мора; бабёр – балотны цясляр; зязюля – лясная варажбітка; вайна – крывавая завіруха; бульба – другі хлеб; радзіма – прадзедаў зямля.

***Максімальная колькасць балаў – 4.***

**Заданне 3.** ***Біць у літаўры!*** (Літаўры - 'ударны музычны інструмент у выглядзе двух паўшар'яў, абцягнутых скурай').

***Максімальная колькасць балаў – 2.***

**Заданне 4.**

| Слова з арфаграфічнай памылкай **0,25 – за слова** | Нарматыўнае напісанне **0,25 – за слова** | Правіла **(па 0,5 за кожны правільны адказ)** |
|---|---|---|
| незмоўклымі | нязмоўклымі | У першым складзе перад націскам у словах славянскага паходжання пішацца літара *я*. |
| ржэўнік | іржэўнік | Прыстаўная літара *і* пішацца перад збегам зычных, першы з якіх *р*, калі папярэдняе слова заканчваецца на зычны гук. |
| недаючы | не даючы | Часціца *не* пішацца з дзеепрыслоўямі асобна. |
| пачэрнелым | пачарнелым | Не пад націскам у словах славянскага паходжання замест *о, э* заўсёды пішацца *а*. Правіла "*акання*". |

***Максімальная колькасць балаў – 4.***

**Заданне 5.**

| **Значэнне фразеалагізма** | **Фразеалагізм** |
|---|---|
| 1) ‘у каго-небудзь няма грошай’ | вецер гуляе (свішча, стаў) у кішэнях |
| 2) ‘хто-небудзь вельмі легкадумны, несур’ёзны’ | вецер у галаве (гуляе, свішча, стаў); з ветрам у галаве; куды вецер дзьме; падбіты ветрам; як у полі вецер |
| 3) ‘назад не вернеш, не знойдзеш каго-небудзь; пра безнадзейныя пошукі каго-небудзь’ | шукай ветру ў полі; лаві вецер у полі |
| 4) ‘рабіць што-небудзь сабе на шкоду’ | пляваць супраць (супроць) ветру |

***Максімальная колькасць балаў – 4.***

**Заданне 6.**

| Словазлучэнні | Спалучэнні слоў |
|---|---|
| не зважаць на спёку | у залежнасці ад звестак |
| зыходзіць з меркаванняў | дзякуючы суседу |
| адказаць на запытанне | на працягу зімы |
| дзякаваць таварышу | зыходзячы з меркаванняў |
| спазнацца з бядой (*спазнаць бяду*) | накшталт грыба |

**Каментарый.** Налічваецца па 0,25 бал. за пераклад і 0,25 – за правільнае размяшчэнне ў табліцы.

***Максімальная колькасць балаў – 5.***

**Заданне 7. Напрыклад:** 1) Вясна яшчэ вернецца, ***калі яе не затрымаюць халодныя вятры і сцюжы.***

2) Вясна яшчэ вернецца, ***таму што птушкі прынясуць яе на сваіх крылах.***

3) Вясна яшчэ вернецца, ***каб ажывіць зямлю і чалавека.***

4) Вясна яшчэ вернецца, ***дарма што наперадзе тры доўгія месяцы чакання.***

***Максімальная колькасць балаў – 4.***

**Заданне 8.** А = 3, Б = 5, В = 1, Г = 4, Д = 2, Е = 6.

***Максімальная колькасць балаў – 3.***

**Заданне 9.**

1) *Летапісы* – творы старажытнай літаратуры, у якіх запіс дакладных звестак пра пэўныя падзеі, сведкам якіх быў летапісец, спалучаўся з літаратурна апрацаванымі паданнямі пра падзеі ранейшыя, мінулыя.

2) Шматзначны вобраз, від іншасказання, які асноўваецца на падабенстве ці агульнасці прадметаў, з’яў і заключаецца ва ўмоўным абазначэнні сутнасці якой-небудзь з’явы, у літаратуры называецца *сімвалам*.

3) *Ода* – урачысты, узнёслы верш у гонар нейкай з’явы, падзеі ці асобы.

***Максімальная колькасць балаў – 3.***

**Заданне 10.** 1Г, 2В, 3Е, 4Б, 5Д, 6А.

***Максімальная колькасць балаў – 6.***